4. Календарь для духовенства Могилевской еп. На 1899г. – Могилев, 1899. – С. 133-134
5. Арх. Сергий. Из истории православия и братской школы г. Могилева // Могилевские ЕВ. – 1885. – №3. – С.57
6. Поселянин Е. (Погожев Е.Н.) Богоматерь. Полное иллюстрированное описание ея земной жизни и посвященных ея имени чудотворных икон. – СПб, 1910 – С. 462-463
7. Жывапіс Беларусі XII-XVIII стагоддзяў / Аўтар ўступнага артыкула Н.Ф. Высоцкая. – Мінск, 1980. – Ил. 46
8. Быцева І.М., Хадыка Ю.В. Разьба на фанах абразоў як датуючая прыкмета // Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск, 1988. – С.30-34
9. Православные монастыри Беларуси. – Минск, 2003. – С.119-120, 124-125.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**А. Трусаў**

# БУДАЎНІЧАЯ КЕРАМІКА МАГІЛЁВА XVII–XVIII стст.

Пасля атрымання ў другой палове XVI ст. поўнага Магдэбургскага права, г.Магілёў стаў вельмі хутка расці і да канца XVI ст. стаў адным з самых вялікіх беларускіх гарадоў у Вялікім Княстве Літоўскім. У гэты час гарадскія кварталы ўзнікаюць за Дняпром і Дубравенкай. У 1578г. каля гарадской брамы ў Старым горадзе будуецца першая драўляная ратуша, а на гарадскіх вуліцах з'яўляецца каменны брук.

Вакол горада будуюцца магутныя ўмацаванні. Так, магілёўскі замак у гэты час атрымаў форму пяцікутніка, што складаўся з драўляных вежаў васьмiграннай формы і сценаў-гародняў.

У пачатку XVII ст. горад абносіцца высокімі земляныміваламі з бастыёнамі і атрымлівае тры лініі магутных умацаванняў: Замкавы, Кругавы (альбо Бліжні) і Палявы (Дальні) валы з прыгожымі вежамі-брамамі. З іх чатыры былі мураваныя. Гэта брамы Ветраная, Каралеўская (унутры абкладзеная чорным мармурам), Алейная і Дубровенская.

Паміж Дубровенскай брамай і замкавымі ўмацаваннямі была зроблена каменная сцяна з амбразурамі. Такім чынам, магілёўскае мураванае дойлідства пачынаецца ў пачатку XVII ст.

У XVII-XVIII ст. тут склалася мясцовая архітэктурная школа. Для яе ўласціва спалучэнне элементаў барока і мясцовых архітэктурна-будаўнічых традыцый. Характэрнай рысай культавых будынкаў магілёўскай школы з'яўляецца творчы сінтэз аб'ёмна-планіровачнага рашэння беларускіх праваслаўных трохаспідных крыжова-купальных храмаў і заходнееўрапейскіх трохнефавых базілік. Так, напрыклад, для Мікалаеўскай царквы XVII ст. уласцівы двухвежавы галоўны фасад, пластыку якога ствараюць размешчаныя ярусамі вакон ныя

праёмы і нішы розных формы [1, С.258]. Інтэр'еры магілёўскіх храмаў аздоблены разнымі іканастасамі і алтарамі, якія зроблены ў адпаведнасці з традыцыямі беларускай драўлянай разьбы.

Акрамя абарончых і культавых будынкаў у Магілёве будуецца шмат свецкіх пабудоў. Сярод іх магілёўская ратуша, арсенал, друкарня, крамы, шматлікія жылыя будынкі шляхты, багатых купцоў і рамеснікаў. Шмат якія каменныя пабудовы пазначаны на гарадскіх планах Магілёва канца XVIII-XIX стст.

Актыўнае каменнае будаўніцтва прывяло да ўзнікнення ў Магілёве вытворчасці розных будаўнічых матэрыялаў.

Менавіта канец XVI-XVIII ст. быў росквітам ганчарства ў Магілёве. Тут існаваў адзіны ганчарны цэх, які аб'ядноўваў рамеснікаў розных спецыяльнасцей. Як паведамляюць пісьмовыя крыніцы, вырабам будаўнічых матэрыялаў займаліся майстры-кафляры. Аднак ў першай палове XVIII ст. у горадзе ўжо існавалі асобныя рамеснікі-цагельнікі [2, С.43-44].

Часам разам з ганчарамі і цагельнікамі ў адзін цэх уваходзілі і муляры. Напрыклад, у Менску з 1636 года існаваў цэх, дзе аб'ядналіся ганчары, муляры і цеслі. Аднак у 50-70-х гг. XVII ст. цеслі выйшлі з гэтага цэху і ён стаў муляр-ска-ганчарскім. [3, С.69].

Магілёўскія муляры ўзводзілі каменныя будынкі, выкарыстоўваючы два віды муроўкі: мяшаную і цагляную. У тэхніцы мяшанай муроўкі звычайна рабілі падмуркі. Так, напрыклад, падмуркі магілёўскай ратушы залягалі не глыбока: на 30-70 см. Складзены ён з шэрагу вялікіх камянёў, прамежкі паміж якімі закладзены цэглай і цагляным друзам на вапнавай росчыне. [4, С.56]. Падмуркі з валуноў і цэглы, дзе цэгла пераважае, мелі і іншыя гарадскія будынкі XVII ст. [5, С.364].

Фасады магілёўскіх будынкаў поўнасцю тынкаваліся, таму ўжывалася роўнашэраговая цагляная муроўка, дзе няма ніякай паслядоўнасці ў чаргаванні старчакоў і рубаў (кароткіх і доўгіх бакоў цаглін).

Аднак, часам, некаторая паслядоўнасць у чаргаванні старчакоў і рубоў была. Так, напрыклад, муры магілёўскай ратушы складзены з тонкай цэглы-пальчаткі ў тэхніцы муроўкі — шэраг рубаў, шэраг старчакоў.

Падмуркі пабудоў Мікольскага манастыра XVII ст. залягаюць на глыбіні каля 130 см і складзены з цэглы і вялікіх камянёў. Тэрыторыя манастыра выкарыстоўвалася і як могільнік. Перад уваходам у Мікольскую царкву ў 1980 годзе археолагі выявілі два пахавальныя цагляныя склепы XVII ст. з паўцыркульным перакрыццем. У іх муроўцы адсутнічае пэўная сістэма перавязкі цэглін.

Трэба адзначыць, што будаўнічую кераміку Магілёва доўгі час ніхто не вывучаў. Першым быў мясцовы краязнаўца І.І.Філіновіч, які ў 60-70-я гады мінулага стагоддзя сабраў калекцыю старой цэглы і ласкава дазволіў аўтару ёю карыстацца. Пераважная колькасць апрацаванай намі цэглы датуецца сярэдзінай — другой паловай XVII ст. У гэты час тоўстая цэгла знікае ў фартыфікацыйным, грамадзянскім і культурным дойлідстве, а на змену ёй у бу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даўнiцтве на Беларусі прыходзіць цэгла таўшчынёй ад 5 да 6,5 см. Адначасова з памяншэннем таўшчыні цэглы павялічваецца яе шырыня і асабліва даўжыня (розніца ў даўжыні цэглы аднаго фармату часам дасягае 3-3,5 см). Гэта абумоўлена пераходам на атынкоўку фасадаў і, даволі часта, на бессістэмную муроўку. Вынікі даследаванняў магілёўскай цэглы пададзены ў наступнай табліцы (знакам "+" пазначаны помнікі, на якіх замерана менш 10 цаглін):

| Назва помніка | Час пабудовы | Фармат цэглы ў см. | Кароткая хар-ка паверхні |
|---|---|---|---|
| Замкавы бровар + | Перш. пал. XVII ст. | 31 x 16,5 x 8 | Адбіткі пальцаў на паверхні цэглы адсутнічаюць |
| Багаяўленскі сабор Брацкага манастыра + | 1637-1663 | 30 x 14,5 x 7; 27 x 13,5 x 6,5 | Барозны ідуць паралельна бакавым граням паверхні |
| Фарны касцёл + | перш. пал. XVII ст. | 31,5 x 14,5 x 4,5 | -x- |
| Мікольская царква | 1669-1672 | 29-30,5 x 14,5-15 x 6,5-7; 33 x 15 x 4; 30 x 15 x 6,5 | Барозны ідуць наўкос (пад вуглом у 45 гр.) |
| Жылы будынак каля Мікольскай царквы | др. пал. XVII ст. | 31-32 x 14-15 x 5 | ? |
| Званіца Мікольскай царквы | 70-80-я гг. XVII ст. | 32 x 15 x 5 | ? |
| Рэшткі жылых карпусоў Брацкага манастыра | сяр.-др.пал. XVII ст. | 26-27 x 15-16 x 6-6,5; 27 x 12-13 x 4-5; 21-22 x 13-14 x 5-5,5 | Барозны на паверхні ідуць наўкос (пад вуглом у 45 гр.) |
| Жылы будынак на вул. Ленінскай | др. пал. XVII ст. | 34 x 15 x 5 | Барозны на паверхні ідуць наўкос (пад вуглом у 45 гр.) |
| Езуіцкі калегіум | канец XVII ст. | 29-30 x 14,5-15 x 4,5-5; 30,5-32,5 x 14-15x4,5-5 | - x - |
| "Арсенал" | канец XVII ст. | 30,5-32,5 x 15 x 4-5 | - x - |
| Касцёл св. Антонія | 1702 – 1720 | 27,5 x 14,5 x 5 | - x - |

Магілёўская цэгла другой паловы XVII ст. мае ярка-чырвоны колер, зроблена з добра перамешанага глінянага цеста з дамешкам пяску. Характэрная асаблівасць магілёўскай цэглы – на многіх вырабах барозны на адной паверхні ідуць не паралельна бакавым граням, а наўкос. Колькасць барознаў – ад 3 да 4. Па знешнім выглядзе і па памерах магілёўская цэгла вельмі нагадвае старажытную плінфу, гэта акалічнасць часам прыводзіла ў зман некаторых даследчыкаў. Падобная да магілёўскай, цэгла ўжывалася ў гэты час у іншых гарадах Беларусі, напрыклад, у Мсціславе [6. С.22]. На паверхнях некаторых цаглін XVII ст. ёсць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбіткі лап жывёл, звычайна гэта сляды катоў або сабак, што сведчыць аб яе вытворчасці падобна, як і ў XIV- XVI стст. цеста ў формы набівалася эучным спосабам, а прасушваліся вырабы перад абпалам пад навесамі або ўвогуле пад адкрытым небам, на пяску альбо траве.

У час рэстаўрацыі Мікольскай царквы раскрыты фрагменты падлогі, зробленай са спецыяльнай цэглы квадратнай і ромбападобнай формаў. Кавалкі цэглы ад падлогі знойдзены ў час раскопак магілёўскай ратушы.

Акрамя спецыяльнай цэглы падлогі ў пабудовах XVII ст. выкладаліся з непаліваных плітак. Рэшткі такой падлогі знойдзены пры даследаваннях жылой пабудовы на Падміколлі. Пліткі чатырохвугольныя (каля 15 х 25 см). іх паверхня моцна спёртая. На адваротным баку плітак прасочваюцца барозны ад пальцаў. На адной з іх ёсць адбітак катовай лапы. Пліткі клаліся на вапнавай росчыне, пад якой маецца падушка з гліны і бітай цэглы. Пліткі памерам 20 х 30 х 3 см. знойдзены на падворку Мікольскага манастыра.

Да будаўнічых матэрыялаў адносяцца і шматлікія фрагменты пляскатай дахоўкі XVII ст., знойдзеныя ў час раскопак. Адзін край магілёўскіх даховак прамавугольны, другі – скруглены. На прамавугольным краі вырабаў, прыкладна пасярэдзіне, размешчаны прамавугольны або квадратны мацавальны шып вышынёй ад 3 да 3.5 см. Таўшчыня дахоўкі вагаецца ад 1,4-1,6 да 1,8 см, зроблена яна з добра перамешанага цеста і мае светла-карычневы колер. Пры вырабе яе рэшткі гліны з формы выбіраліся ўжо не пальцамі, а спецыяльнай прыладай. Трэба адзначыць кавалкі даховак, пакрытых глухой зялёнай палівай. Акрамя пляскатай дахоўкі знойдзены фрагменты вільчаковай, якая мела паўкруглую форму. Дахоўка, аналагічная магілёўскай, існуе на Беларусі да канца XVII ст. і затым паступова змяняецца хвалістай (або галандскай). Таксама ў XVII ст. з майстэрань ганчароў выходзіла пляскатая паліваная дахоўка, аздобленая арнаментам у выглядзе буйной рыбінай лускі. Акрамя Магілёва, такую дахоўку археалагі знайшлі ў Мсціславе і Гродне [7, С.87].

**Літаратура:**


1. Могилёв. Энциклопедический справочник. Минск, 1990.
2. Марзалюк Ігар. Магілёў у XII- XVII стст. Людзі і рэчы. Мінск, 1998.
3. Цітоў Анатоль. Менск – места майстроў. – Мінск, 2002.
4. Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Беларуси XI-XVII вв. – Минск,1988.
5. Чернявский И.М. Архитектурно-археологические исследования в Гомельской и Гродненской областях // Археологические открытия 1981 года. - Москва, 1983.
6. Трусаў Алег. Манументальнае дойлідства Беларусі XI-XVII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. - Мінск. 2001.
7. Трусаў А.А. Старонкі мураванай кнігі. – Мінск, 1990.




РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ